Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 МАЯ 2017 г. СУБОТА № 89 (28453)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## СІМВАЛЫ ЯДНАННЯ

***Дарагія суайчыннікі!***

Сардэчна віншую вас з Днём Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь.

Гэтыя сімвалы аб'ядноўваюць грамадзян нашай суверэннай краіны, натхняюць іх на вялікія здзяйсненні, беззапаветнае служэнне Айчыне.

Кожны з нас павінен разумець: вернасць Радзіме пачынаецца з павагі да нацыянальнай сімволікі і гераічнай гісторыі.

Беларусь адбылася як незалежная дзяржава, якая адстойвае ідэі міру і сацыяльнай справядлівасці. Яна паспяхова развіваецца, расце яе міжнародны аўтарытэт. У гэтым велізарная заслуга нашага працавітага і мужнага народа, які ўпэўнена стварае сваю будучыню.

Ад усёй душы жадаю вам святочнага настрою, дабрабыту, поспехаў у працы дзеля працвітання роднай зямлі.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый СЯНЬКО, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта:**

*«У першым квартале 2017 года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2016-га аб'ём увезеных праз мытную мяжу ЕАЭС у Рэспубліку Беларусь транзітных тавараў павялічыўся на 18%. Гэты факт сведчыць аб паляпшэнні транзітнай прывабнасці краіны і стварэнні спрыяльных умоў для перасячэння мытнай мяжы Еўразійскага эканамічнага саюза».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.05.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8733 | ▲ |
| Еўра | 2,0347 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0327 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0707 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# 55 адценняў ізумруднага



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Леанід і Лілія ЯШЧУКІ — 55 гадоў у шлюбе пасля двух тыдняў знаёмства.

СТАР. 3

■ Добрая навіна

## АД «ХАЛОПА»-ЖУКА ДА «АКУЛЯРАЎ У МІНУЛАЕ»

### Талачынскі гісторыка-краязнаўчы музей выйграў грант Прадстаўніцтва ААН у Беларусі

**На атрыманыя грошы плануецца стварыць інтэрактыўную музейную прастору. Напрыклад, у зале прыроды пры выкарыстанні спецыяльных акуляраў можна будзе апынуцца ў лесе. І ўбачыць, як тэхнагенныя аварыі ўплываюць на наваколле. Акуляры віртуальнай рэальнасці ў этнаграфічнай зале дапамогуць пагрузіцца ў нарыхтоўку зёлак, ільну... Наведвальнікам паралельна растлумачаць, што такое этнабатаніка і этнабіялогія. Для арганізацыі экскурсій тут будуць выкарыстоўваць інфакіёскі і вялікія маніторы. У сценах музея стане зручна праводзіць семінары і майстар-класы. Усё гэта дазволіць павялічыць колькасць наведвальнікаў. Пакуль што тут прадаюць каля 4 тысяч квіткоў у год.**



Будынак музея ў Талачыне.

**Адчуць Сярэднявечча**

Музей у Талачыне адкрылі ў 2001-м, у год святкавання 1000-годдзя Друцка. Ён месціцца ў доме, пабудаваным у канцы пазамінулага стагоддзя. Дакладна невядома, што тут было да рэвалюцыі 1917-га. Па адной з версій, у будынку жыў уласнік завода, па іншай — знаходзіўся зямельны банк. Цяпер у асноўным фондзе музея больш за 10 тысяч прадметаў, акрамя таго, гэта ўстанова культуры валодае адной з самых багатых на Віцебшчыне калекцый археалагічных артэфактаў.

СТАР. 5

## ПЯЦЬ ЖЫЦЦЯЎ СТАДЫЁНА «ДЫНАМА»

### Якім ён быў і якім стане

**Самы вялікі стадыён краіны, які бачыў так шмат бітваў, перамог і слёз, зараз падобны на раскіданае гняздо. Літаральна праз месяц яму споўніцца 83 гады, а свой наступны дзень нараджэння ён павінен адсвяткаваць ужо ў новым абліччы, бо ў 2019-м «Дынама» будзе прымаць Еўрапейскія гульні. Гэта стане адной з самых важных падзей для спартыўнага аб'екта з вялікай гісторыяй. Галоўныя вехі жыцця стадыёна ўспамінаем за 9 месяцаў да меркаванага заканчэння рэканструкцыі.**

СТАР. 13

